*М. В. Швед* (ДУА «Сярэдняя школа № 15 г. Баранавічы»)

# АКТЫВІЗАЦЫЯ СЛОЎНІКАВАГА ЗАПАСУ ВУЧНЯЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

**Анатацыя**. У артыкуле разглядаюцца асаблівасці развіцця звязнага маўлення малодшых школьнікаў. Акцэнтуецца ўвага на прыёмах і заданнях для пашырэння і актывізацыі слоўнікавага запасу вучняў.

Адной з асноўных задач сучаснай школы з'яўляецца развіццё звязнага маўлення школьнікаў. Настаўнікі пачатковых класаў павінны закласці падмурак, сфарміраваць устойлівы слоўнікавы запас, які б вучні папаўнялі на працягу далейшага навучання. Без багатага лексічнага запасу немагчыма якасна ўспрымаць новую інфармацыю, перапрацоўваць яе, выкарыстоўваць у жыцці. Уменне выкарыстоўваць слоўнікавы запас з'яўляецца важнейшым падмуркам маўленчага і інтэлектуальнага развіцця чалавека.

Словы – своеасаблівы будаўнічы матэрыял, які служыць не толькі сродкам называння прадметаў, але і выражэння паняцця пра іх. У сувязі з гэтым лексічнай працы ў школе адводзіцца вельмі важнае месца.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вучням пачатковых класаў цяжка засвойваць матэрыял, выказваць свае думкі, будаваць звязнае выказванне на беларускай мове. Гэта звязана з невялікім слоўнікавым запасам, з няўменнем выкарыстоўваць тую ці іншую лексічную адзінку ў маўленні. Таму настаўнік на ўроках не толькі ўзбагачае слоўнікавы запас вучняў, але і сістэматычна праводзіць работу па актывізацыі слоўніка, г.зн. стварае вучэбныя сітуацыі па выкарыстанні новых слоў у працэсе маўлення на розных этапах урока: у час правядзення хвілінкі чыстапісання, арфаграфічнай пяціхвілінкі, выканання вусных і пісьмовых практыкаванняў.

Практыка пацвярджае, што вучні намнога лепш запамінаюць і выкарыстоўваюць новыя словы, калі настаўнік арганізуе работу на аснове тэматычнага прынцыпу, у адпаведнасці з якімновыя словы вывучаюцца групамі – адзенне, мэбля, посуд, ежа, дрэвы, кветкі, звяры і свойскія жывёлы і г. д. У якасці асноўных прыёмаў тлумачэння лексічнага значэння слоў могуць быць выкарыстаны дэманстрацыя прадметаў, малюнкаў, муляжоў (*кашуля, канапа, патэльня, валошкі, певень, аладкі* і інш.), а таксама тлумачэнне сэнсу незнаёмага слова праз падвядзенне відавога паняцця пад родавае (*камізэлька – гэта адзенне, ложак – прадмет мэблі, сподачак – посуд*). Цікава будзе прапанаваць вучням паспрабаваць растлумачыць сэнс слова з апорай на яго марфемную будову: *сальнічка* (які корань мае слова?) *– посуд, дзе захоўваецца соль; завушніцы* (вызначыце корань у слове) – *упрыгожванні, якія носяць у вушах; вячэраць* (назавіце корань у гэтым слове) – *спажываць ежу вечарам*.

Работа па актывізацыі слоўнікавага запасу малодшых школьнікаў вядзецца паралельна з вывучэннем граматыкі і правапісу і спрыяе лепшаму засваенню граматычнага матэрыялу. Таму ў вучэбным дапаможніку пад рэдакцыяй А.П. Шанько[1] вылучаюцца наступныя віды слоўнікавых практыкаванняў, якія настаўнікі школ актыўна выкарыстоўваюць у сваёй практыцы: слоўнікава-граматычныя, слоўнікава-лагічныя і слоўнікава-стылістычныя.

Цікавымі для вучняў з'яўляюцца наступныя віды слоўнікава-граматычных практыкаванняў:

− падбярыце словы-прадметы, якія маюць у сваім саставе склад «ка», падбярыце да іх словы-прыметы (капуста, карова, сабака, вавёрка, страказа, пралеска);

− падбярыце аднакарэнныя словы да слоў: *гусь, рука*(гусыня, гусяня, гусіны; ручны, наручнікі, нарукаўнік);

− падбярыце да прадметаў словы-дзеянні: *лямпачка, дровы, бутэлька, аладкі*(словы для даведак: калоць, укручваць, з'есці, разбіць);

− суаднясіце прадмет і прыкмету прадмета, складзіце спалучэнні слоў:

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| | |
|---|---|
| *канапа* | *рознакаляровы* |
| *дыван* | *паласатыя* |
| *крэсла* | *мяккае* |
| *шпалеры* | *вялікае* |
| *люстэрка* | *вуглавая* |

Практыкаванні слоўнікава-лагічнага характару вучаць назіраць, абагульняць, параўноўваць, сістэматызаваць атрыманыя веды, напрыклад:

– назавіце адным словам: *кашуля, панчохі, камізэлька – ...* (адзенне); *аладкі, цукар, селядзец – ...* (ежа);

– дапоўніце пералік словамі: *посуд* (што?) *лыжка, ... ; звяры* (хто?) *воўк, ...* ; *людзі* (хто?) *будаўнік, ...*;

– супастаўце два словы па ўзоры: *бяроза – дрэва, а падбярозавік – грыб; чарніцы – чарнічнік; будоўля – будаўнік*;

– знайдзіце чацвёртае лішняе: *званочкі, ружа, клён, рамонкі* (клён); *напарстак, адвёртка, скрыпка, сякера* (скрыпка);

– прапанаваныя словы падзяліце на тры групы – посуд, адзенне, ежа: *бутэлька, сукенка, цукерка, кажух, шклянка, кашуля, лыжка, пернік, патэльня, спадніца, аладкі, хустка, алей, кубак, скарынка, шалік*;

– па азначэнні пазнайце слова: *від мяккай мэблі, прызначаны для сядзення, ляжання* (канапа); *шкляная пасудзіна, якая шчыльна закрываецца* (слоік); *група зорак, аб'яднаная агульнай назвай* (сузор'е) і інш.

Слоўнікава-стылістычныя практыкаванні з'яўляюцца самымі складанымі відамі слоўнікавых практыкаванняў, таму настаўнікі выкарыстоўваць іх на заключным этапе ўрока, пераканаўшыся, што тэарэтычны матэрыял засвоены на дастаткова высокім узроўні і выпрацаваны практычныя ўменні і навыкі, вызначаныя праграмай. Умовы да слоўнікава-стылістычных практыкаванняў могуць змяшчаць заданні такога тыпу:

– выберыце патрэбнае слова з прапанаваных: *Вецер (свішча, скуголіць) у полі*;

– замяніце адно словазлучэнне другім з блізкім значэннем: *сок з яблык* (яблычны сок), *ваза са шкла, сукенка з шэрсці, варэнне з маліны*;

– падбярыце словы, якімі можна апісаць талерку (якая?): *вялікая, шкляная, зялёная, круглая*;

– апішыце сябра, выкарыстаўшы словы: *валасы* (русыя, чорныя), *вочы* (блакітныя, шэрыя, зялёныя), *вусны* (вузкія, ружовыя), *вушы* (вялікія, маленькія), *твар* (круглы, авальны) і інш.

З улікам узроставых асаблівасцей вучняў пачатковых класаў настаўнік на ўроку беларускай мовы часта выкарыстоўвае заданні з элементамі займальнасці, пры выкананні якіх вучні павінны ўключыць новыя словы ў актыўнае маўленне, напрыклад:

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

– устаўце галосныя, каб атрымаліся назвы адзення: *штн* (штаны), *скнк* (сукенка), *спднц* (спадніца), *плт* (паліто), *пнжк* (пінжак);

– запішыце ў радок словы, каб апошні склад папярэдняга слова быў пачаткам наступнага слова: *фут**ра***, ***рабі**на*, ***на**вальні**ца***, ***цацка***, ***ка**напа* і інш.

Практыка пацвярджае, што багаты слоўнікавы запас вучняў і актыўнае яго выкарыстанне ў паўсядзённым жыцці садзейнічае выразнаму і дакладнаму выражэнню асабістых думак вучняў, а таксама адэкватнаму ўспрыманню чужога маўлення, пачутай або прачытанай інфармацыі.

## Літаратура


1. Методыка выкладання беларускай мовы ў пачатковых класах: вуч. дапаможнік для фак. педагогікі і методыкі пачатковага навучання пед. ін.-таў / Я.М. Івашуціч [і інш.]; пад рэд. А. П. Шанько. – Мінск: Выш. шк., 1986. – 408 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова